Нерухомасць

Адкладзены попыт нікуды не дзеўся

На думку экспертаў, на рынку жылля цяпер назіраецца максімальная актыўнасць пакупнікоў

Пасля крызісу ў мінулым годзе рынак кватэр краіны паступова ажывае. Адкрыццё крэдытавання другаснага рынку нерухомасці дало магчымасць шматлікім жыхарам рэгіёнаў вырашыць сваё кватэрнае пытанне. Менавіта таму колькасць здзелак з кватэрамі ў II квартале вырасла паўсюдна, а ў асобных гарадах колькасць прададзеных за красавік-чэрвень кватэр стала як мінімум адной з самых высокіх за апошнія гады.

СВАЕ РЭКОРДЫ

Другі квартал у цэлым быў вельмі актыўным ва ўсёй краіне. Напрыклад, у Мінску колькасць прададзеных кватэр была адной з максімальных для красавіка-чэрвеня з 2012 года, а ў большасці абласных цэнтраў і наогул — адной з самых высокіх за ўсё дзесяцігоддзе.

На рынку кватэр у буйных гарадах, на думку аналітыкаў партала realt.by, таксама назіралася ажыўленне. Асабліва прыкметна адкладзены попыт праявіў сябе ў Бабруйску, Барысаве, Лідзе і Мазыры — сумарна колькасць прададзеных кватэр была адной з самых высокіх за ўвесь перыяд назіранняў. Адзіным горадам, дзе істотных змен ва ўзроўні попыту не адбылося, быў Салігорск — тут пасля рэзкага падзення пакупніцкай актыўнасці ў II квартале мінулага года колькасць здзелак застаецца на стабільна нізкім узроўні.

ЯКІЯ КВАТЭРЫ ВЫБІРАЛІ?

Традыцыйна найбольшым попытам у жыхароў рэгіёнаў карысталіся двухпакаёвыя кватэры — у залежнасці ад горада на іх прыходзілася ад 40 % да 48 % усіх прададзеных. Асабліва высокая іх доля была ў Полацку (48 %), Лідзе (47 %) і Бабруйску (47 %).

Каля 30—38 % здзелак заключалі з аднапакаёвымі кватэрамі. Выключэннем сталі буйныя гарады Брэсцкай вобласці, Баранавічы і Пінск, дзе доля маленькіх кватэр у агульным попыце была прыкметна вышэйшая — 40 % і 46 % адпаведна.

Колькасць здзелак з трохпакаёвымі кватэрамі не перавышала 27 % ад агульнай колькасці здзелак у тым ці іншым горадзе (такой была іх максімальная доля ў Оршы і Маладзечне), а ў палове гарадоў і зусім была меншая за 20 %. Радзей за ўсё куплялі шматпакаёвыя кватэры ў Пінску (15 % ад усяго попыту) і Полацку (13 %).

У Гродне і Брэсце па 35 % усіх прададзеных у красавіку-чэрвені кватэр знаходзіліся ў сучасных дамах, пабудаваных пасля 2010 года. У астатніх буйных гарадах краіны асноўная маса кватэр (у сярэднім каля 40 %) размяшчалася ў дамах 1971—1990 гадоў пабудовы.

У ВІЦЕБСКУ — ДАРАЖЭЙ, А Ў БРЭСЦЕ — ТАННЕЕ

У адрозненне ад сталіцы, дзе за квартал кошт квадратнага метра ў здзелках практычна не змяніўся, дынаміка цэн у буйных гарадах краіны была куды больш прыкметная. Сярод абласных цэнтраў рост цэн быў зафіксаваны ў Магілёве і Віцебску — плюс 3,6 % у абодвух гарадах у параўнанні з сакавіком. У той жа час у Гомелі і Брэсце, наадварот, за тры месяцы кватэры сталі таннейшыя на 3,4 % і 1,5 % адпаведна. Адзіным выключэннем стаў Гродна, дзе сярэдняя цана «квадрата» практычна не змянілася.

Сярод буйных гарадоў найбольшае зніжэнне цэн на кватэры дэманстравалі Полацк (мінус 6,6 % да сакавіка), Маладзечна (мінус 5,1 %) і Барысаў (мінус 4,2 %). Найбольш прыкметна за квартал падаражэў квадратны метр у Салігорску (плюс 4,2 %), Пінску (плюс 3,6 %) і Оршы (плюс 2,1 %).

Сяргей КУРКАЧ.

ХЛОПЦЫ БУДУЦЬ ЖЫЦЬ!

Урачоў, якія выратавалі хлопчыкаў Рамана і Вадзіма з моцнымі апёкамі, прадставяць да дзяржузнагарод. Ход лячэння дзяцей знаходзіўся на асабістым кантролі кіраўніка дзяржавы, паведамляе Telegram-канал «Пул Першага».

«Пост пра герояў нашага часу. Памятаеце двух хлапчукоў, якія літаральна адзін за адным некалькі месяцаў таму атрымалі найцяжэйшыя апёкі? Адзін — Вадзім — зачапіўшыся вудай за правады, другі — Рома — гераічна ратуючы маленькага брата з палаючага дома», — нагадваюць перадгісторыю аўтары рэсурсу.

Хлопчыкаў тады падтрымлівалі ўсёй краінай, а Прэзідэнт узяў іх лячэнне на асабісты кантроль. Былі прапановы Рому адправіць у Расію, бо вельмі складаная была сітуацыя, але кіраўнік дзяржавы прыняў рашэнне працягваць лячыць у Беларусі.

«І нашы медыкі хлопчыкаў выратавалі! Вадзім пасля лячэння ў Мінску быў пераведзены ў магілёўскую бальніцу на рэабілітацыю (у дзіцяці было 70 % апёкаў цела!). І ўчора ўжо выпісаны дадому. Стан Ромы таксама ўдалося стабілізаваць. За гэты час хлопчык перанёс 22 аперацыі — найлепшыя ўрачы краіны змагаліся за яго жыццё. На сённяшні дзень ён з рэанімацыі пераведзены ў дзіцячае апёкавае аддзяленне», — піша Telegram-канал.

«Ну а Першы (Прэзідэнт Беларусі. — **«Зв».**) даручыў узнагародзіць героя! Усіх урачоў, якія ратавалі дзіцячыя жыцці, прадставяць да дзяржаўных узнагарод. Атрымае ўзнагароду і Рома Кагадоўскі, які вынес на сваіх руках з агню двухгадовага браціка», — гаворыцца ў паведамленні рэсурсу.

Будзь у курсе!

ГАЙДА Ў БРУСНІЦЫ І ЖУРАВІНЫ!

Міністэрства лясной гаспадаркі інфармуе грамадзян аб тэрмінах збору брусніц і журавін у 2021 годзе, устаноўленых рашэннямі абласных выканаўчых камітэтаў.

Так, у Брэсцкай вобласці брусніцы дазволена збіраць з 10 жніўня, журавіны — з 4 верасня. У Віцебскай выпраўляцца ў лясныя ўгоддзі ў брусніцы можна будзе з 14 жніўня, у журавіны — з 8 верасня. У Гомельскай вобласці гэтыя тэрміны складуць адпаведна 10 жніўня і 4 верасня, у Гродзенскай вобласці — 12 жніўня і 6 верасня. Збіраць брусніцы на Міншчыне можна з 12 жніўня, журавіны — з 8 верасня. У Магілёўскай вобласці наведваць лясы з мэтай збору ягад дазволена адпаведна з 12 жніўня і 6 верасня.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ПАГРАЖАЎ СЯКЕРАЙ МЯСЦОВЫМ ЖЫХАРАМ

Агрэсіўнага мужчыну спынілі з прымяненнем табельнай зброі

Увечары ў міліцыю паступіла паведамленне, што ў Чавусах на вуліцы Сіманава каля жылых дамоў заўважаны чалавек з сякерай, які візуальна знаходзіцца ў стане ап'янення. Сваім выглядам і паводзінамі ён стварыў пагрозу грамадзянам, што знаходзіліся на вуліцы.

На месца неадкладна выбыў нарад міліцыі. Агрэсіўна настроенага мужчыну супрацоўнікі спачатку спрабавалі супакоіць і пераконвалі адкінуць сякеру. Затым у мэтах забеспячэння грамадскай бяспекі прыбыўшую дадатковыя нарады акружылі дэбашыра, не даючы яму магчымасці збегчы.

Як паведамляе УУС Магілёўскага аблвыканкама са спасылкай на тэлеграм-канал «Прэс-сакратар МУС Беларусі», мужчына не рэагаваў на неаднаразовыя патрабаванні спыніць супрацьпраўныя дзеянні і папярэджанні аб выкарыстанні ў дачыненні да яго фізічнай сілы і табельнай зброі. Ён працягваў размахваць сякерай, выказваючы пагрозы гвалту ўжо на адрас міліцыянераў. Папераджальныя стрэлы ў паветра таксама не спынілі грамадзяніна, і супрацоўнікі міліцыі выкарысталі зброю.

Затрыманы шпіталізаваны, яго стан здавальняючы, небяспекі для жыцця няма. Агрэсарам аказаўся 34-гадовы неаднаразова судзімы мясцовы жыхар.

Па факце пагрозы прымянення гвалту ў дачыненні да супрацоўніка міліцыі следчымі заведзена крымінальная справа.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Памяць

КАСЦЯНІ. ЛЯСНАЯ ПРЭЗЕНТАЦЫЯ

Мікалая Чаркашына добра ведаюць чытачы ў Расіі і ў Беларусі. Дзясяткі яго кніг прысвечаны ваеннай гісторыі. Шмат напісана пра ваенных маракоў розных пакаленняў. Многія сюжэты звязаныя з Беларуссю. Ды і сам пісьменнік нарадзіўся на Гродзеншчыне, у Ваўкавыску.

А з нядаўняга ў рускага пісьменніка і такая повязь з нашай старонкай: у лесе, на Слонімшчыне, непадалёку ад вёскі Касцяні прайшла прэзентацыя новых раманаў Мікалая Чаркашына «Берасцейскія вароты» і «Бог не гуляе ў косці». Чаму ў лесе? Чаму на Слонімшчыне?

— І для мяне гэта самая незвычайная прэзентацыя ў журналісцкім, пісьменніцкім лёсе, — расказвае празаік. — Замест залы быў лес, які трымае ў памяці драматычныя падзеі 1941-га, жорсткія баі чырвонаармейцаў з фашысцкімі захопнікамі. Гледачы-слухачы былі апранутыя ў палявую форму салдат беларускай арміі — гэта байцы і камандзіры 52-га асобнага спецыялізаванага пошукавага батальёна...

Але настраёвасць, асаблівы характар напружанасці, перажывання прэзентацыі надавала тое, што ўсе ведалі — і аўтар кніг, і пошукавікі: у гэтай лясной зямлі — байцы 1941 года, якія змагаліся на Слонімшчыне ў першыя тыдні Вялікай Айчыннай...

— У гэты палявы сезон 52-гі батальён разам з пошукавікамі атрада «Бацькаўшчына», што ўзначальвае Аляксандр Дударэнка, разам з паплечнікамі з Татарстана, якія ўжо больш за дзесяць гадоў вядуць свой пошук у тутэйшай старонцы, вызвалілі з бяспамяцтва, з чорнага спіса «зніклых без вестак» цэлы ўзвод — 42 чалавекі, — дзеліцца ўражаннямі пісьменнік. — Адзін з іх — пакуль што безыменны камандзір, якога знайшлі разам са службовай пячаткай, што належала Свіслацкаму ваеннаму камісарыяту. Па ёй, несумненна, удасца ўстанавіць яго прозвішча. На вырытых з зямлі біклажках, падсумках, лыжках надрапаныя прозвішчы: «Обухов», «Парфоменко», «(Б)езруков»... У гэтых байцоў ёсць шанцы «перадаць» вестачку сваім нашчадкам, родзічам. Справа часу. А яго ў салдат колькі было, гэтулькі і засталося, — цэлая вечнасць...

— Мікалай Андрэевіч, — пытаюся ў пісьменніка, — напішаце апавяданне ці аповесць з гэтым слонімскім адрасам?

— Я вельмі люблю ездзіць у Беларусь. Тут у мяне процьма знаёмых краязнаўцаў, гісторыкаў, цяпер вось некалькі гадоў выбіраю любую вольную хвіліну, каб далучыцца да работы пошукавікаў... Пасля сустрэч са слонімска-зэльвенскімі лясамі ў блакноце самі па сабе ўзнікаюць радкі новага рамана. Гэтым разам — пра баі пад Гродна, пра байцоў і камандзіраў 3-й арміі, той самай, на долю якой выпала і жорсткае адступленне, і пераможнае наступленне, выпала і ўзяцце Берліна таксама. У выніку ў мяне атрымліваецца трылогія: дзве кнігі — «Берасцейскія вароты» і «Бог не гуляе ў косці» — ужо прадстаўлены чытачам. Цяпер справа за трэцім раманам. Ён пакуль што без назвы... Затое імёны герояў прыдумваць не трэба — перапісвай з кацялкоў ды салдацкіх падсумкаў, ці з медальёнаў, калі яны захаваліся...

Сяргей ШЫЧКО.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

У Германіі з-за страйку на чыгунках адмянілі большасць цягнікоў

Страйк прафсаюза супрацоўнікаў чыгуначнага транспарту GDL праходзіць у Германіі, з-за чаго выконваецца толькі чвэрць рэйсаў. Аб гэтым паведамляецца на сайце чыгуначнай кампаніі Deutsche Bahn. «У тым, што датычыцца цягнікоў далёкага накіравання, дзейнічае часовы план, з якім мы можам выканаць прыкладна чвэрць маршрутаў. Тым не менш, у гэтай сітуацыі мы не можам гарантаваць, што ўсе падарожнікі дабяруцца да месца прызначэння», — адзначае кампанія. Паводле яе даных, забастоўка прывяла да «буйных абмежаванняў у руху цягнікоў далёкага накіравання і рэгіянальных маршрутаў». Акцыя таксама закранула сістэму гарадскіх электрычак Берліна S-Bahn. Мяркуецца, што страйк працягнецца да 13 жніўня.

У Гвінеі з'явіўся яшчэ адзін смяротны вірус

Сусветная служба аховы здароўя і ўрад Гвінеі афіцыйна пацвердзілі першы выпадак смерці ад хваробы Марбурга, паведаміла Бі-бі-сі. Яе выклікае вірус, падобны па сваіх уласцівасцях на вірус ліхаманкі Эбола. Гэтак жа як каранавірус, які з'яўляецца прычынай COVID-19, хвароба Марбурга перадаецца ад жывёл да людзей. Узровень смяротнасці вар'іруецца ад 24 да 88 працэнтаў. Вірус пашкоджвае органы стрававання і цэнтральную нервовую сістэму, лячэнне праходзіць цяжка. Першымі сімптомамі з'яўляюцца высокая тэмпература, моцны галаўны боль і слабасць. Асноўнымі пераносчыкамі даволі рэдкай інфекцыі лічацца кажаны. Заражэнне часта адбываецца пасля наведвання пячор або закінутых горных выпрацовак, дзе маюцца калоніі гэтых жывёл. Супраць дадзенай формы гемарагічнай ліхаманкі пакуль не існуе ні вакцыны, ні лекаў. Пакуль невядома, ці паспеў «нулявы пацыент» заразіць яшчэ кагосьці.

150 тысяч жыхароў былі эвакуіраваны ў Кітаі з-за сланоў-валацуг

Статак з 15 сланоў пачаў мігграваць з Мацзян-Ханійскага аўтаномнага павета яшчэ ў красавіку гэтага года. Па меры набліжэння жывёл да населеных пунктаў, мясцовых жыхароў часова эвакуіравалі, паведаміла інфармацыйнае агенцтва «Сіньхуа». Усяго за гэты час у паўднёва-заходняй правінцыі Кітая Юньнань былі эвакуіраваны больш за 150 тысяч жыхароў. Для забеспячэння бяспекі людзей былі задзейнічаныя 25 тысяч паліцэйскіх. За перамяшчэннем сланоў сачылі як з зямлі, так з і паветра — з дапамогай дронаў. Жывёлы пераадолелі больш за 1,3 тысячы кіламетраў.